Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласвыканкома.

Год выдання другі.

№ 40 (109)
НЯДЗЕЛЯ
18
ЛЮТАГА
1940 г.

Цана 10 капеек

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 16 лютага на Карэльскім перашэйку працягвалі развівацца паспяховыя дзеянні нашых войск. Працўнік імкнуўся контратакаваць нашы часці, але з вялікімі стратамі адкінут на ўсіх участках. Нашы часці з боем занялі ст. Лейпясуо і ст. Кямяра.

За мінуўшы дзень нашымі войскамі занята 22 абаронных умацаваных пункты працўніка, з іх 2 жалезабетонных артылерыйскіх. збудаванні

За 7 дзён наступлення нашых часцей страты працўніка ў захопленых намі ўмацаваных пунктах складаюць 420 кулямётаў, 170 гармат.

На астатніх участках фронта адбываліся пошукі разведчыкаў і месцамі сутычкі пяхотных часцей.

Наша авіяцыя вяла актыўныя баявыя дзеянні па войсках і па ваенных аб'ектах працўніка. У адбыўшыхся паветраных баях збіта 5 самалётаў працўніка.

ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНЫХ СОВЕТАЎ СССР І БССР

Вяліка любоў народа да сваей партыі, да свайго ўрада

Выбарчая кампанія ў самым разгары. Па большасці выбарчых акруг ужо вылучаны кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР. Названы імёны самых лепшых, адданых радзіме людзей. Спісак кандыдатаў паказвае, як вяліка любоў вызваленага народа да сваей партыі, да свайго ўрада, да свайго правадыра любімага Сталіна. На ўсіх сходах рабочых, служачых, інтэлегенцыі, сялян называецца імя любімага Сталіна, якога народ жадае бачыць сваім першым кандыдатам. З любоўю называюцца імёны таварышоў Молатава, Варашылава, Кагановіча, Калініна, Жданава, Андрэева, у асобе якіх народы заходніх абласцей бачаць сваіх вызваліцеляў, сваіх кіраўнікоў.

Спісак кандыдатаў — гэта яркая дэманстрацыя дружбы народаў усіх нацыянальнасцей. У спіску мы бачым беларуса Сяргея Осіпавіча Прытыцкага, паляка Івана Антонавіча Турлейскага, яўрэя Абрама Гешэлевіча Машэвіцкага. Мы бачым імёны жанчын, якія ў былой Польшчы блізка не допускаліся да кіравання дзяржавай, як напрыклад, Марыю Канстанцінаўну Пятроўскую і Марыю Іванаўну Дз'ячук. Мы бачым у спіску кандыдатаў прадстаўнікоў усіх пластоў насельніцтва: рабочага-чыгуначніка Беластоцкага вузла Пятра Кірылавіча Вайцэшука, селяніна Валкавыскага раёна Паўла Антонавіча Сеўко, паэта Філіпа Сямёнавіча Пестрака.

Вяліка любоў народа да сваей партыі, да лепшых яе сыноў. Невялікая група комуністаў, якая з першых дзён вызвалення заходніх абласцей працуе ў нашай абласці, сумела за кароткі тэрмін акружыць сябе вялікім актывам рабочых, сялян і інтэлігенцыі, сумела абаперціся на гэты актыў і весці за сабой усю масу працоўных. Народы Заходняй Беларусі ведаюць, што комуністы былі ў першых радах воінаў Чырвонай Арміі, якая вызваліла іх з-пад панскага прыгнёту. Комуністы нястомна працуюць над выкарчоўваннем рэштак ворагаў народа. Комуністы працуюць з усёй энергіяй, каб папраўдзе наладзіць усё гаспадарчае жыццё, якое было дэзарганізавана польска - германскай вайной. Для комуністаў няма больш важных інтарэсаў, чым інтарэсы народа, і народ плоціць такой-жа любоўю членам партыі Леніна—Сталіна. Гэта любоў ярка прадэманстравана на агульных сходах пры вылучэнні кандыдатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

У ліку кандыдатаў мы бачым імёны партыйных кіраўнікоў нашай абласці: першага сакратара Беластоцкага абкома КП(б)Б Сямёна Сцяпанавіча Ігаева сакратара Беластоцкага гаркома КП(б)Б Грыгорыя Майсеевіча Гершмана, сакратара Гродненскага гаркома КП(б)Б, Івана Барысавіча Паздднякова і іншых. Вылучаючы гэтых людзей, працоўныя могуць быць упэўнены, што яны аддадуць усе сілы, усю большэвіцкую энергію служэнню народу.

Вялікай любоўю вызваленага народа карыстаецца наша любімая Чырвоная Армія. Выражаючы гэту любоў, на шматлікіх сходах працоўныя вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР ветэрана грамадзянскай вайны, тройчы ордэнаносца, камандуючага Асобай Беларускай Ваеннай Акругай Кавалёва Міхаіла Пракоф'евіча. Тав. Кавалёў камандаваў дзеючымі часцямі Чырвонай Арміі пры вызваленні Заходняй Беларусі з-пад прыгнёту капіталістаў і памешчыкаў. Тав. Кавалёва добра ведаюць працоўныя Беластока; ён бываў на многіх фабрыках і заводах, гутарыў з рабочымі, раіў ім, як трэба будаваць новае, шчаслівае жыццё. Няма ніякага сумнення, што кандыдатура тав. Кавалёва будзе падтрымана усімі выбаршчыкамі 597 Беластоцкай выбарчай акругі.

Днямі адбудуцца акруговыя прадвыбарчыя нарады упаўнаважаных агульнымі сходамі выбаршчыкаў. Яны збяруцца, каб сказаць сваё слова аб вылучаным кандыдаце па данай акрузе. Акруговыя прадвыбарчыя нарады павінны прайсці з такой-жа актыўнасцю, з такім-жа аднадушшам, як праходзілі самі агульныя сходы. Удзельнікі акруговых нарад выконваюць волю мас выбаршчыкаў і падтрымаюць вылучаных на агульных сходах кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і БССР.

Ворагі народа, бачачы аднадушша і згуртаванасць працоўных мас вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол свайго Советскага ўрада, разумеючы сваю немінучую пагібель, будуць чапляцца за малейшую магчымасць, каб у тым або іншым месцы перашкодзіць паспяховаму правядзенню выбарчай кампаніі. Пільнасць, рэвалюцыйная пільнасць — вось што патрабуецца ад кожнага чэснага грамадзяніна, каб канчаткова выкрыць і да канца разграміць усіх і ўсялякіх ворагаў народа, каб забяспечыць новую перамогу сталінскаму блоку комуністаў і беспартыйных у прадстаўчых выбарах.

«о»

СХОДАМ НАСТАЎНІКАЎ гор. БЕЛАСТОКА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА САЮЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Ковалёў Міхаіл Пракоф'евіч

(На сходзе прысутнічала 680 чалавек)

На агульным сходзе настаўнікаў гор. Беластока, прысвечаным вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і БССР, выступіў дэпутат Народнага Сабрання, намеснік загадчыка гарадскога аддзела народнай асветы тав. Машэвіцкі Абрам Гешэлевіч.

— Я прапаную, — гаворыць тав. Машэвіцкі, — вылучыць ад настаўнікаў Беластока кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР тав. Кавалёва Міхаіла Пракоф'евіча.

Тав. Кавалёў — выхадзец з рабочага класа, сам рабочы, асабіста ўдзельнічаў на многіх франтах грамадзянскай вайны, тройчы ордэнаносец, кандыдат у члены ЦК ВКП(б) і член бюро ЦК КП(б)Б. Тав. Кавалёў з'яўляецца дастойным сынам вялікай партыі Леніна—Сталіна, верным сынам працоўнага народа. Па ўказанню Советскага ўрада тав. Кавалёў вёў чырвоныя палкі, каб вызваліць народы Заходняй Беларусі ад прыгнёту памешчыкаў і капіталістаў, каб назаўсёды з'яднаць беларускі народ у адзінай сям'і грамадзян Советскага Саюза. Пад яго камандаваннем дзеючыя часці Чырвонай Арміі ачысцілі Заходнюю Беларусь ад рэшткаў польскай арміі, прынеслі працоўным свабоду, радаснае і шчаслівае жыццё.

— Усе мы, — гаворыць тав. Машэвіцкі,—з радасцю будзем галасаваць за нашага камандарма тав. Кавалёва.

Кандыдатуру тав. Кавалёва горача падтрымаў тав. Кандрацюк.

Сход аднадушна прыняў пастанову: „Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР тав. Кавалёва Міхаіла Пракоф'евіча, члена ВКП(б), камандуючага Асобай Беларускай Ваеннай Акругай, камандарма 2-га ранга і прасіць тав. Кавалёва даць сваю згоду балатыравацца на па 597 выбарчай акрузе".

* * *

Такі-ж сход адбыўся на мясакамбінаце. На сходзе прысутнічала 245 чал. Галоўны інжынер мясакамбіната тав. Давыдовіч унёс прапанову аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР камандарма 2 ранга, тройчы ордэнаносца тав. Кавалёва Міхаіла Пракоф'евіча.

Сход падтрымаў гэту прапанову і аднагалосна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тав. Кавалёва Міхаіла Пракоф'евіча.

МОСКВА, КРЭМЛЬ

ПРАВАДЫРУ НАРОДАЎ ВЯЛІКАМУ СТАЛІНУ

Дарагі, горача любімы наш Іосіф Вісарыёнавіч!

Рабочыя, работніцы і інжынерна-тэхнічны персанал 2 тэкстыльнага камбіната гор. Беластока, сабраўшыся на сход, прысвечаны абмеркаванню і вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і БССР, шлюць Вам, лепшаму другу вызваленага народа Заходняй Беларусі, тварцу найвялікшага ў свеце дакумента — Канстытуцыі СССР, — сваё гарачае прывітанне.

З захапленнем народы Заходняй Беларусі сустракалі Чырвоную Армію. Чырвоная Армія вернула свайму інтэрнацыянальнаму доўгу, прынесла мільёнам людзей вызваленне ад капіталістычнага рабства і нацыянальнага прыгнёту. Чырвоная Армія вызваліла народы Заходняй Беларусі ад вайны і прынесла нам мір і свабоду.

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

Ваш гістарычны дакумент — Канстытуцыя СССР адкрыла новую эру разгорнутага соцыялістычнага дэмакратызма. Ваша Канстытуцыя ваклікала небывалы ўздым палітычнай актыўнасці народаў вялікага Советскага Саюза.

У слаўным сузор'і адзінаццаці соцыялістычных рэспублік, азароная праменнямі Сталінскай Канстытуцыі, квітнее свабодная і шчаслівая, навекі з'ядная Советская Беларусь.

Умацоўваючы сваю соцыялістычную дзяржаву, усё вышэй паднімаючы яе эканамічную і абаронную магутнасць, яе міжнародную вагу, народы СССР пільна і спакойна, з поўнай упэўненасцю ў сваё сілы сочаць за прошукамі ворагаў СССР.

Няхай ворагі памятуюць, што соцыялістычная дзяржава, кіруемая вялікім геніем усяго передавога прагрэсіўнага чалавецтва — Вамі, таварыш Сталін, нікім і ніколі непераможна.

Мы, рабочыя, работніцы, інжынерна-тэхнічны персанал, звяртаемся з просьбай да Вас, вялікі Сталін, быць нашым першым кандыдатам.

Галасуючы за Вас, мы будзем галасаваць за непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных.

Галасуючы за Вас, мы галасуем за шчасце народаў.

Галасуючы за Вас, мы галасуем за комуністычную партыю, якая вядзе народы вялікага Советскага Саюза да зіяючых вяршынь комунізма.

Няхай жыве і здраўствуе доўгія годы на радасць і блага працоўным усяго свету, на страх ворагам наш правадыр, настаўнік і бацька Іосіф Вісарыёнавіч СТАЛІН!

Прынята на агульным сходзе рабочых, работніц і інжынерна-тэхнічнага персанала 2-га тэкстыльнага камбіната г. Беластока.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ ЧЛЕНАЎ ПРОФСАЮЗА гор. ВАЛКАВЫСКА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Прытыцкі Сяргей Осіпавіч

(На сходзе прысутнічала 570 чалавек)

У памяшканні кінотэатра Валкавыска 16 лютага адбыўся сход членаў профсаюза горада. На сходзе абмяркоўвалася пытанне аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

На сходзе выступіў тав. Клімашэўскі.

— Ідучы на сход,—гаворыць ён,—я меркаваў, каго нам вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета, і прышоў да вывады, што лепшай кандыдатурай ад нас будзе Прытыцкі Сяргей Осіпавіч. Яго дзейнасць непарыўна звязана з барацьбой працоўных Заходняй Беларусі за іх вызваленне. У барацьбе з прыгнятальнікамі працоўных былой панскай Польшчы ён, як мужны і бясстрашны сын беларускага народа, не шкадаваў свайго маладога жыцця. Я прапаную падтрымаць кандыдатуру тав. Прытыцкага ад імені нашага схода.

Прапанову тав. Клімашэўскага горача падтрымалі тт. Місюля, Дегцяроў, Селіцкі, Шацілa і інш.

Сход у сваей пастанова падтрымаў кандыдатуру тав. Прытыцкага ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

* * *

З вялікім уздымам прайшоў сход сялян вёскі Гаркавічы, Сакалкаўскага раёна, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. У гэтай вёсцы нарадзіўся С. О. Прытыцкі, выстаўлены кандыдатам у дэпутаты працоўнымі Гродзеншчыны і Валкавыска.

На сход з'явілся ўсе аднасяльчане — 119 чалавек. Яны з вялікай радасцю падтрымалі кандыдатуру С. О. Прытыцкага і аднагалосна рашылі вылучыць тав. Прытыцкага кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

КАЛЕКТЫВАМ РАБОЧЫХ АЎГУСТОЎСКАГА ЛЕСАЗАВОДА «ЛІПАВЕЦ» ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Аўхімовіч Нікалай Ефрэмавіч

(На сходзе прысутнічала 520 чалавек)

На заводзе „Ліпавец" адбыўся сход рабочых, прысвечаны вылучэнню кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. На сходзе з прапановай аб вылучэнні кандыдата выступіў дырэктар завода тав. Іванісаў.

— Я прапаную, — гаворыць тав. Іванісаў, — вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР сакратара РК КП(б)Б тав. Аўхімовіча.

Агульны сход рабочых аднадушна падтрымаў прапанову тав. Іванісава і вылучыў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР першага сакратара Аўгустоўскага райкома КП(б)Б тав. Аўхімовіча Нікалая Ефрэмавіча і звярнуўся да яго з просьбай даць сваю згоду балатыравацца па гарадской выбарчай акрузе № 325.

НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ СЯЛЯН ВЁСАК ЛАЎНА І ПУЗЕВІЧЫ ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Мікула Вікенцій Сцяпанавіч

(На сходзе прысутнічала 175 чалавек)

На агульным сходзе сялян вёсак Лаўна і Пузевічы, Скідзельскага раёна, па прапанове селяніна Бідковіча Грыгорыя вылучан кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Мікула Вікенцій Сцяпанавіч, 1903 года нараджэння. Тав. Мікула нарадзіўся ў сям'і беларуса селяніна-бедняка, да прыходу Чырвонай Арміі працаваў на сваей гаспадарцы, з моманту ўстанаўлення советскай улады быў старшынёй сялянскага камітэта і актыўна змагаўся з бандамі белапольскіх афіцэраў. Зараз тав. Мікула працуе загадчыкам комунальнага аддзела Скідзельскага райвыканкома.

Сход просіць тав. Мікулу даць згоду для балатыроўкі па 367 выбачай акрузе.

НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ СЯЛЯН КУПІСКАГА СЕЛЬСАВЕТА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Курпеўскі Антоні Осіпавіч

(На сходзе прысутнічала 300 чалавек)

Сход сялян Купіскага сельсовета, Ломжынскага раёна, прысвечаны вылучэнню кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР адкрыў старшыня сялянскага камітэта тав. Гундзілеўскі.

Слова для прапановы атрымлівае селянін-бядняк Зажчэк

— Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Курпеўскага Антона Осіпавіча. Курпеўскі нарадзіўся ў 1903 годзе ў сям'і батрака, усё сваё жыццё гнуў сваю спіну на польскіх паноў і буржуяў. Ён апраўдае наша давер'е.

Кандытатуру тав. Курпеўскага падтрымаў селянін Файкоўскі.

Сход прыняў пастанову, у якой вылучае тав. Курпеўскага Антона Осіпавіча кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і просіць яго даць згоду для балатыроўкі па Ломжынскай сельскай выбарчай акрузе.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ КОЛЬНІЦА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Рыжкевіч Франц Антонавіч

(На сходзе прысутнічала 250 чалавек)

У вёсцы Кольніца, Аўгустоўскага раёна, адбыўся сход сялян, на якім абмяркоўвалася пытанне аб вылучэнні кандыдату ў Вярхоўны Совет БССР. З прапановай выступіў член валаснога камітэта тав. Дзержынскі.

— Я ўнашу прапанову вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Рышкевіча Франца Іосіфавіча. Я ўпэўнен, што тав. Рышкевіч апраўдае наша давер'е. Я ведаю тав. Рышкевіча як адданага сына нашай радзімы. Ён з'яўляецца дэпутатам Народнага Сабрання, ён галасаваў на Сабрані за ўстанаўленне советскай улады.

Гэтая прапанова тав. Дзержынскага была аднадушна падтрымана сялянамі. Сход рашыў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Рышкевіча Франца Іосіфавіча і звярнуўся да яго з просьбай даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

СХОДАМ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ м. ЗАРЭМБА, ЧЫЖАЎСКАГА РАЁНА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Вайткоўскі Александр Станіслававіч

(На сходзе прысутнічала 45 чалавек)

З вялікім уздымам прайшоў сход інтэлігенцыі м. Зарэмба, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Сход аднадушна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Зарэмбаўскай выбарчай акрузе № 339 ад інтэлігенцыі м. Зарэмба тав. Вайткоўскага Александра Станіслававіча, паляка па нацыянальнасці, 1888 года нараджэння, батрака, зараз працуючага старшынёй Чыжаўскага сельсовета.

Сход пастанавіў прасіць тав. Вайткоўскага даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты па Зарэмбаўскай выбарчай акрузе.

ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНЫХ СОВЕТАЎ СССР і БССР

НА СХОДЗЕ НАСТАЎНІКАЎ БЕЛАСТОКА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Машэвіцкі Абрам Гешэлевіч

(На сходзе прысутнічала 680 чалавек)

Ва ўрачыстай абстаноўцы ў Доме партактыва сабраліся настаўнікі і тэхнічныя работнікі школ горада Беластока, каб вылучыць кандыдатаў у дэпутаты соцыялістычнага парламента.

Па даручэнню гаркома прэфсаюза работнікаў пачатковых і сярэдніх школ сход адкрыў тав. Фешчанка.

У адзіным парыве сход вылучыў першымі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета таварыша Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў таварышоў Молатава і Жданава.

Па прапанове тав. Машэвіцкага сход аднадушна падтрымаў кандыдатуру камандуючага Асобай Беларускай Ваеннай Акругі камандарма 2 га ранга тав. Кавалёва Міхаіла Пракоф'евіча, вылучанага кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР.

Настаўнікі горача падтрымалі, па прапанове тав. Бузіцкай, кандыдатуру тав. Турлейскага Івана Антонавіча, вылучанага кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР.

На трыбуне — настаўнік Стэц Станіслаў Карлавіч.

— Я прапаную, — гаворыць ён, — вылучыць ад настаўнікаў гор. Беластока кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Машэвіцкага Абрама Гешэлевіча. Я добра ведаю тав. Машэвіцкага, бо працаваў з ім у вячэрняй школе. Гэта сардэчны і чулы чалавек, які ўсё сваё свядомае жыццё прысвяціў справе народнай асветы, справе працоўных. Тав. Машэвіцкі будзе дастойным нашым кандыдатам.

З падтрыманнем кандыдатуры тав. Машэвіцкага выступіў настаўнік тав. Зайдлер Самуіл. Ён гаворыць:

— Усе мы добра ведаем тав. Машэвіцкага як дэпутата Народнага Сабрання, які правільна выявіў волю народа. На пасадзе намесніка загадчыка горана тав. Машэвіцкі праявіў сябе здольным і адданым работнікам. Мы з радасцю аддадзім свае галасы за тав. Машэвіцкага, вернага сына працоўнага народа.

Цёпла сустрэлі прысутныя выступленне тав. Машэвіцкага, які падрабязна расказаў сваю аўтабіяграфію і горача дзякаваў выбаршчыкам за аказваемае давер'е. Тав. Машэвіцкі гаворыць:

— Я разумею абавязкі дэпутата і ўскладаемую на яго адказнасць. Я запэўніваю вас, што прыкладу ўсе свае сілы, каб з чэсцю апраўдаць ваша давер'е. Перада мною заўсёды будзе тып дзяржаўнага дзеяча, якім быў вялікі Ленін і якім з'яўляецца вялікі Сталін.

Сход аднадушна прыняў пастанову, у якой гаворыцца:

„Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Машэвіцкага Абрама Гешэлевіча, 1894 года нараджэння, яўрэя, дэпутата Народнага Сабрання, у сучасны момант працуючага намеснікам загадчыка горана. Прасіць тав. Машэвіцкага даць сваю згоду балатыравацца па 354 выбарчай акрузе".

На сходзе выбрана 23 делегаты на акруговы прадвыбарчы сход.

КАЛЕКТЫВАМ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ТЭКСТЫЛЬНАГА КАМБІНАТА № 5 ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Прохараў Нікалай Іванавіч

(На сходзе прысутнічала 1000 чалавек)

Учора адбыўся сход рабочых тэкстыльнага камбіната № 5, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР. Прадвыбарчы сход адкрыў старшыня фабкома тав. Грыцук.

Слова прадастаўляецца тав. Рачынскаму Людвігу. Ён прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Прохарава Нікалая Іванавіча.

— Тав. Прохараў, член бальшавіцкай партыі, сын рабочага, працуе загадчыкам ваеннага аддзела ЦК КП(б)Б, ордэнаносец. Я ўпэўнен, што тав. Прохараў апраўдае давер'е народа. Ён па-сталінску будзе змагацца за інтарэсы рабочых, за далейшае ўмацаванне Совецкага Саюза.

Сход аднадушна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Прохарава Нікалая Іванавіча.

КАЛЕКТЫВАМ РАБОЧЫХ ІНЖЫНЕРНА - ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ І СЛУЖАЧЫХ ГРОДНЕНСКАГА ВЕЛАСІПЕДНАГА ЗАВОДА «НЕМАН» ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Ратайка Пётр Іванавіч

(На сходзе прысутнічала 160 чалавек)

Вестка аб тым, што калектыў завода будзе вылучаць кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, з вялікай хуткасцю абляцела калектыў рабочых і служачых Гродненскага веласіпеднага завода „Неман".

Напружаная цішыня. Прысутныя ўважліва слухаюць выступленне тав. Пінскага.

— Сёння радасны дзень у жыцці калектыва нашага завода,—гаворыць ён.— На аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі мы вылучаем кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ад калектыва нашага завода аднаго з дастойных прадстаўнікоў совецкай улады, сына бедняка селяніна—старшыню Гродненскага гарвыканкома тав. Ратайка Пятра Іванавіча. Я ўпэўнен, што тав. Ратайка з чэсцю апраўдае наша давер'е.

Прапанову тав. Пінскага аднадушна падтрымалі ўсе прысутныя.

„Ад імені калектыва рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых Гродненскага веласіпеднага завода „Неман", — гаворыцца у прынятай пастанове, — вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па 370 выбарчай акрузе гор. Гродна тав. Ратайка Пятра Іванавіча, 1898 года нараджэння, беларуса, члена ВКП(б), пражываючага ў гор. Гродна.

Прасіць тав. Ратайка Пятра Іванавіча даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Гродненскай выбарчай акрузе № 370".

КАЛЕКТЫВАМ РАБОЧЫХ БЕЛАСТОЦКАГА ФАНЕРНАГА ЗАВОДА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Турлейскі Іван Антонавіч

(На сходзе прысутнічала 600 чалавек)

Канец работы дзённай змены. У прасторным цэху завода сабраліся рабочыя і работніцы. Па сярэдзіне цэха імправізаваная трыбуна, упрыгожаная чырвонымі палотнішчамі. На сценах цэха — лозунгі і транспаранты.

600 рабочых абступаюць трыбуну. Сакратар пярвічнай партарганізацыі завода т. Мазо адкрывае сход.

Слова атрымлівае рабочы тав. Здравамыслаў Пётр:

— 24 сакавіка мы будзем выбіраць сваіх дэпутатаў у Вярхоўны Совет Совецкага Саюза. Дэпутатамі павінны быць выбраны лепшыя людзі, да канца адданыя бальшавіцкай партыі, нашаму народу, якія аддаюць сябе цалкам рабоце для блага совецкага народа.

Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета вернага сына рабочага класа тав. **Турлейскага Івана Антонавіча**. Тав. Турлейскі нарадзіўся ў сям'і чыгуначніка. Ён з юнацкіх год прымаў актыўны ўдзел у барацьбе супроць ненавісных капіталістаў. За рэволюцыйную работу яго арыштоўвалі і саджалі ў турму. Але нічога не зламала яго волі. Ён выходзіў з турмы і зноў актыўна браўся за рэвалюцыйную работу, змагаўся за інтарэсы рабочага класа, за нашы інтарэсы. Яго, як адданага сына народа, выбралі дэпутатам Народнага Сабрання. Тав. Турлейскі галасаваў у Народным Сабранні за ўстанаўленне совецкай улады. Тав. Турлейскі дастойны быць кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета Саюза ССР.

У рэзалюцыі, якая прынята на сходзе, гаворыцца: „Мы, рабочыя і служачыя фанернага завода, аднадушна вылучаем кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР Турлейскага Івана Антонавіча, паляка па нацыянальнасці, нараджэння 1913 года, працуючага на Ломжынскім заводзе сельскагаспадарчых машын у якасці тэхнарука.

Прасіць тав. Турлейскага даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей па Беластоцкай выбарчай акрузе № 581".

З вялікім уздымам сход прыняў прывітанне таварышам Сталіну і Молатаву. У цэху доўга не змаўкалі апладысменты у чэсць правадыра народаў, тварца самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі—любімага Сталіна і главы Совецкага ўрада таварыша Молатава.

РАБОЧЫМІ, РАБОТНІЦАМІ І СЛУЖАЧЫМІ ГРОДНЕНСКАЙ ТАБАЧНАЙ ФАБРЫКІ ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР

Прытыцкі Сяргей Осіпавіч

І КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Ражкоўская Вера Андрэеўна

(на сходзе прысутнічала 600 чалавек)

16 лютага рабочыя Гродненскай табачнай фабрыкі сабраліся пасля работы ў сталовай, каб абмеркаваць пытанне аб вылучэнні кандыдатаў у Вярхоўныя органы ўлады.

Слова атрымлівае тав. Шамет прадстаўнік калектыва фанернага завода, які інфарміруе сход аб рашэнні рабочых фанернага завода, аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР тав. Прытыцкага Сяргея Осіпавіча, сына селяніна-бедняка Саколкаўскага раёна.

У аднагалосна прынятай пастанове гаворыцца: «Мы падтрымліваем прапанову рабочых і служачых фанернага завода і вылучаем кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР тав. Прытыцкага Сяргея Осіпавіча.

Просім тав. Прытыцкага даць сваю згоду балатыравацца па Гродненскай выбарчай акрузе.

За тым слова атрымлівае работніца табачнай фабрыкі тав. Ахрэмук. Яна ўносіць прапанову вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР лепшую работніцу табачнай фабрыкі, першую стаханаўку Веру Андрэеўну Ражкоўскую, якая зараз вылучана на пасаду намесніка начальніка ўпаковачнага цэха.

Гэту прапанову падтрымлівае работніца тав. Осіпава.

— Тав. Ражкоўская першая на нашай фабрыцы падняла вялікі сцяг соцыялістычнага спаборніцтва, першай стала перавыконваць нормы. Яна ўключылася ў стаханаўскі рух і натхніла большасць работніц нашай фабрыкі на соцыялістычныя адносіны да працы, —гаворыць тав. Осіпава.

Аднагалосна прымаецца рашэнне вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Веру Андрэеўну Ражкоўскую. Сход звяртаецца да яе з просьбай даць сваю згоду балатыравацца па 371 выбарчай акрузе.

З кароткай прамовай выступіла тав. Ражкоўская.

— Я дзякую рабочым і служачым нашай фабрыкі,—гаворыць яна,—за вялікую чэсць і давер'е, якое мне аказалі. Абяцаю вам, таварышы, што я буду працаваць яшчэ лепш і апраўдаю ваша давер'е.

КАЛЕКТЫВАМ РАБОЧЫХ БЕЛАСТОЦКАГА ГВАЗДЗІЛЬНАГА ЗАВОДА № 1 ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Іваноў Нікалай Сцяпанавіч

(На сходзе прысутнічала 70 чалавек)

Учора пасля работы адбыўся агульны сход рабочых гваздзільнага завода № 1, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Слова для прапановы атрымаў Карпішук Пётр.

— Набліжаецца радасны дзень, — гаворыць тав. Карпішук,—дзень выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Мы павінны вылучыць кандыдатамі у дэпутаты соцыялістычнага парламента такога чалавека, які да канца аддан совецкаму народу, бальшавіцкай партыі. Я думаю, што такім чалавекам з'яўляецца рабочы нашага завода тав. Іваноў. Я ведаю таварыша Іванова як чэснага рабочага. Працуючы на нашым заводзе, ён паказвае ўзоры соцыялістычнай працы. Тав Іваноў — сын чыгуначнага рабочага. Я прапаную яго кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і заклікаю ўвесь калектыў нашага завода падтрымаць маю прапанову.

Рабочыя аднагалосна пастанавілі вылучыць тав. Іванова Нікалая Сцяпанавіча кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

СХОДАМ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ст. БЕЛЬСК ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Остасевіч Нікалай Леонцьевіч

(На сходзе прысутнічала 55 чалавек).

Рабочыя і служачыя ст. Бельск з вялікім уздымам правялі сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Выступіўшы на сходзе стрэлачнік Уладзімір Якубюк заявіў:

— Таварышы! Мы з вамі перажываем радасныя дні, дні, калі мы—рабочыя і служачые—упершыню атрымалі права выбіраць і быць выбранымі ў Вярхоўныя органы ўлады. Дзень 24 сакавіка — гэта для нас вялікае свята. Я абавязваюся адзначыць яго лепшай стаханаўскай работай.

Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР дэпутата Народнага Сабрання, члена Паўнамочнай Камісіі, старшыню Бельскага валаснога камітэта тав. Остасевіча Нікалая Леонцьевіча. Будучы дэпутатам Народнага Сабрання, ён апраўдаў наша давер'е. Я добра ведаю тав. Остасевіча. Ён актыўна ўдзельнічаў у барацьбе супроць памешчыкаў і капіталістаў. За актыўную рэволюцыйную дзейнасць ён быў асуджан польскімі ўладамі на 10 год. Чатыры годы прасядзеў у турме. і толькі Чырвоная Армія вялікай краіны Советаў вызваліла яго. Тав. Остасевіч — верны сын народа, дастойны наш кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Кандыдатуру тав. Остасевіча падтрымалі дзяжурны па станцыі Пшэнкін, начальнік станцыі Прылуцкі, вартаўнік пераезда Шарамецьеў і іншыя.

Сход аднагалосна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па гарадской Бельскай выбарчай акрузе № 344 ад калектыва чыгуначнікаў ст. Бельск тав. Остасевіча Нікалая Леонцьевіча, 1907 г. нараджэння, беспартыйнага, саматужніка-шаўца, зараз старшыня Бельскага валаснога камітэта, пражываючага у гор. Бельску.

Сход пастанавіў прасіць тав. Остасевіча Нікалая даць сваю згоду балатыравацца па гарадской Бельскай выбарчай акрузе № 344.

АГУЛЬНЫМІ СХОДАМІ СЯЛЯН ВЁСАК МОКРЭ І ДУБЯЖЫНА, БЕЛЬСКАГА РАЁНА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Маўчанскі Дзімітрый Сцяпанавіч

(На сходзе прысутнічала 300 чалавек)

У вёсках Мокрэ і Дубяжына, Орлянскай воласці, Бельскага раёна адбыліся сходы сялян па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. На сходах прысутнічала 300 сялян, сялянак і моладзі. З прапановай аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР на сходзе вёскі Мокрэ выступіў селянін - бядняк Лукашук Іван Антонавіч.

Мы, сяляне, уздыхнулі поўнымі грудзямі. Мы сталі свабоднымі, шчаслівымі грамадзянамі вялікай краіны Советаў. Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР комуніста, сакратара Бельскага райкома партыі тав. Маўчанскага Дзімітрыя Сцяпанавіча. Ён апраўдае наша давер'е і будзе абараняць інтарэсы працоўных.

Кандыдатуру тав. Маўчанскага падтрымалі выступаючыя таварышы Гаральчук Васіль, Лукашук Аляксей і іншыя.

На сходзе ў вёсцы Мокрэ была прынята пастанова, у якой гаворыцца:

„Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Бельскай (сельскай) выбарчай акрузе № 345 ад сялян вёскі Мокрэ тав. Маўчанскага Дзімітрыя Сцяпанавіча, 1901 года нараджэння, селяніна, члена ВКП(б), сакратара РК КП(б)Б, пражываючага ў гор. Бельску.

Прасіць тав. Маўчанскага даць сваю згоду балатыравацца па Бельскай сельскай выбарчай акрузе № 345".

СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ КНОРЫДЫ, БЕЛЬСКАГА РАЁНА КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР ВЫЛУЧАН

Турлейскі Іван Антонавіч

(На сходзе прысутнічала 158 чалавек)

15 лютага адбыўся сход сялян вёскі Кнорыды, Бельскага раёна, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

У сваіх выступленнях сяляне Пашкоў Станіслаў, Рыжык Павел і Федарчук Павел гаварылі аб шчаслівых днях, якія насталі для сялянства заходніх абласцей Беларусі. Першымі кандыдатамі ў Вярхоўны Совет СССР яны назвалі вялікага друга працоўных таварыша Сталіна і яго саратніка ўсесаюзнага старасту тав. Калініна.

Тав. Камінская Марыя ўнесла прапанову падтрымаць ініцыятыву рабочых беластоцкіх прадпрыемстваў і вылучыць кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР тав. Турлейскага Івана Антонавіча, тэхнарука Ломжынскага завода сельгасмашын.

Сход аднагалосна прыняў гэтыя прапановы.

СХОДАМ РАБОЧЫХ СКУРЗАВОДА № 6 гор. КРЫНКІ ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Сеўко Павел Антонавіч

(На сходзе прысутнічала 105 чалавек)

16 лютага адбыўся сход рабочых скурзавода № 6 г. Крынкі, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

У сваім выступленні на сходзе стары рабочы таварыш Білюцін гаварыў:

— Пры польскай уладзе не магло быць і думкі аб вылучэнні рабочых або сялян у сейм ці сенат. Гэта былі органы улады абшарнікаў і капіталістаў. Іх час мінуў. Зараз мы вылучаем сваіх прадстаўнікоў у Вярхоўныя органы улады. Я ўношу прапанову падтрымаць ад імені рабочых нашага завода кандыдатуру тав. Сеўко Паўла Антонавіча, вылучанага сходам сялян м. Мсцібава.

Прапанову тав. Білюціна падтрымалі тт. Лейбовіч, Крэйман, Карнейчук і інш.

У сваёй рэзалюцыі сход пастанавіў падтрымаць кандыдатуру тав. Сеўко і прасіць яго даць згоду балатыравацца па выбарчай акрузе № 601.

НЕЗАБВЕННЫЙ СЕРГО

(К трехлетию со дня смерти Г. К. Орджоникидзе)

Прошло три года с того дня, как оборвалась замечательная жизнь Григория Константиновича Орджоникидзе — неутомимого борца и строителя социализма, выдающегося партийного и государственного деятеля ленинско - сталинского типа. Всю свою жизнь без остатка отдал он борьбе за дело коммунизма, за счастье трудящегося человечества.

Григорий Константинович (Серго) Орджоникидзе вступил в партию в 1903 году, когда ему исполнилось только 17 лет. Это было время его учебы в фельдшерской школе, в которую он поступил после безуспешных попыток получить необходимое образование в родном селе Гореша (Западная Грузия). По поручению Тифлисского партийного комитета Серго повел революционную работу в главных мастерских Закавказской железной дороги. Здесь, общаясь с рабочими, знакомясь с их жизнью, он выработал в себе навыки большевистского агитатора и руководителя. Орджоникидзе смело стал на путь профессионала-революционера, большевика-ленинца.

Под руководством товарища Сталина Серго Орджоникидзе активно работал в большевистских организациях Закавказья. С тех пор он всегда оставался верным другом и соратником великого вождя народов.

В ноябре 1910 года Орджоникидзе приехал в Париж к Ильичу. Он был направлен Лениным в большевистскую партийную школу в Лонжюмо, под Парижем. Здесь Серго получил теоретическую ленинскую закалку. По поручению Ленина, Орджоникидзе летом 1911 года поехал в Россию в качестве уполномоченного по созыву VI партийной конференции. На конференции, состоявшейся в 1912 году в Праге, он был избран членом ЦК и введен в состав Русского бюро ЦК — практического центра по руководству революционной работой в России. Во главе бюро был товарищ Сталин.

Вскоре Серго арестовали. Это был его четвертый арест. Первый раз Серго попал в тюрьму в 1904 году, когда царская полиция задержала его на станции Гори со связкой революционной литературы. В январе 1906 года он был схвачен вблизи Гудаут (Абхазия) в момент выгрузки оружия, которое партия ему поручила переправить в горы. В ноябре 1907 года Орджоникидзе снова арестовали и заключили в Баиловскую тюрьму. Сосланный в Сибирь, он бежал оттуда, нелегально возвратился в Баку и с новой энергией взялся за революционную работу.

После ареста в 1912 году Серго заключили на три года в Шлиссельбург, а затем сослали в Якутск. Здесь он, как и везде, вел неутомимую работу бойца большевистской партии.

В 1917 году Орджоникидзе приехал из ссылки в Петроград. Он стал ближайшим соратником Ленина и Сталина в борьбе против буржуазно - помещичьего временного правительства, в борьбе за власть Советов.

Когда после июльских дней Ленин скрывался в подполье, Серго ездил к нему, информировал о положении в Петрограде и получал директивы для передачи товарищу Сталину.

Серго принимал активное участие в работе VI с'езда РСДРП(б). По поручению ЦК он сделал на с'езде доклад, в котором резко высказался против явки Ленина на суд озверелой буржуазии, на чем настаивали разоблаченные ныне смертельные враги народа Каменев, Рыков, Троцкий и другие.

Боевая работа на фронтах гражданской войны сделала имя Серго Орджоникидзе — «чрезвычайного комиссара» - посланца Ленина и Сталина — любимым и дорогим для трудовых народов Кавказа, для боевых полков Красной Армии Южного и Кавказского фронтов.

